**І. Э. БАГДАНОВІЧ,**
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА ДУБОЎКІ (X клас)

Асоба Уладзіміра Дубоўкі авеяна легендамі і яркай славай паэта-наватара і паэта-грамадзяніна. Яго бліскучы талент стварыў новы кранальны і ўзвышаны вобраз Беларусі часу бурлівых грамадскіх перамен: «О Беларусь, мая шыпшына, // зялёны ліст, чырвоны цвет! // У ветры дзікім не загінеш, // чарнобылем не зарасцеш...» Гэтыя сімвалічныя радкі паэта, можна сказаць, сталі прарочымі для нашага роднага краю на цэлае XX стагоддзе.

Творы У. Дубоўкі дагэтуль вабяць нас харaством і дасканаласцю мастацкай формы, нечаканасцю вобразных асацыяцый, глыбіннай сувяззю з традыцыяй і здольнасцю да смелых авангардных эксперыментаў. Яны выяўляюць няпросты дыялог паэта са сваёй эпохай. Гэты дыялог Дубоўкі набываў палемічнасць і вастрыню. Паэт уплываў на агульную літаратурную сітуацыю таго часу, вакол яго творчасці нязменна распачыналіся крытычныя спрэчкі, дыскусіі. Паэзія У. Дубоўкі ў многім вызначала стыль і творчы кірунак літаратурнага аб'яднання «Узвышша», яна была ўзорам для многіх іншых пісьменнікаў таго часу.

### Жыццёвы і творчы лёс

Жыццё Уладзіміра Дубоўкі складаецца са слаўных і трагічных старонак, а ў яго біяграфіі выразна прасочваюцца *тры* лёсавызначальныя *кругі*. Першы — *зорны*: ён арганізатар «Маладняка» і «Узвышша», паэт — лідэр свайго пакалення, знаходзіўся ў цэнтры ўвагі чытачоў і крытыкі. Другі — *пакутніцкі*: Дубоўка зведаў долю рэпрэсіраванага, ён быў зняволеным і ссыльным, вязнем сталінскага канцлагера, і ўрэшце яго адправілі на «вечнае пасяленне» ў Краснаярскі край. Трэці перыяд можна назваць *мудра-цярплівым*, калі рэабілітаваны паэт вярнуўся пасля дваццаці сямі год выгнання,

зноў актыўна ўключыўся ў літаратурнае жыццё Беларусі 1960—1970 гадоў. У гэты перыяд ён напісаў нямала новых твораў, у тым ліку казкі і аповесці, а за цыкл вершаў «Палеская рапсодыя» ў 1962 годзе стаў лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы.

Уладзімір Дубоўка нарадзіўся 15 ліпеня 1900 года ў вёсцы Агароднікі, якая цяпер знаходзіцца ў Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці. Скончыў Нова-Віленскую настаўніцкую семінарыю (1918), паступіў у Маскоўскі універсітэт. Масква становіцца для Дубоўкі пастаянным месцам жыхарства. Так склаліся сямейныя абставіны: яго бацька, працаўнік чыгункі, у 1915 годзе, падчас Першай сусветнай вайны, выехаў з Беларусі, атрымаў працу па спецыяльнасці ў Маскве. Там жа ўладкавалася і ўся сям'я. Але сэрца Уладзіміра Дубоўкі належала Беларусі, і гэта адчуваецца па яго вершах і яго ладзе жыцця з пастаяннымі вандроўкамі на радзіму. Маскоўскі універсітэт Дубоўка не скончыў. Ён мусіў перапыніць вучобу і працаваць, каб дапамагаць сям'і. Ён настаўнічаў на Тульшчыне, у 1920—1921 гадах служыў у войску, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. Затым паэт вярнуўся ў Маскву, працаваў інспектарам беларускіх школ пры Наркамаце асветы РСФСР. У гэты час ён часта наведваў Беларусь, актыўна займаўся літаратурнай працай, рыхтаваў свой першы зборнік вершаў «Строма», вучыўся ў Вышэйшым літаратурным інстытуце імя В. Брусава.

Заняткі літаратурай захапілі Дубоўку. Дзякуючы вялікаму таленту, пранікліваму розуму, эрудыцыі ў ім жыла цяга не толькі да паэтычнай творчасці, але і да навуковых беларусазнаўчых пошукаў. Аб гэтым сведчаць шматлікія артыкулы Дубоўкі ў часопісе «Узвышша», прысвечаныя фальклору, музыцы, а таксама беларускай мове — яе лексічным і графічным асаблівасцям. Сам паэт быў тонкім знаўцам роднай мовы і яе наватарам у паэзіі. Ён абнавіў слоўнік беларускай мовы за кошт ажыўлення даўно забытых слоў (напрыклад *угрунь*), а таксама ствараў новыя словы і новыя граматычныя формы слоў (напрыклад *адлюстроўваць*). На старонках часопіса «Узвышша» Дубоўка нязменна звяртаў увагу на культуру мовы, раіў пазбягаць у літаратурным маўленні і стылі непатрэбных русізмаў, безгустоўных вобразаў.

**Пачатак творчасці.** У беларускай паэзіі імя Уладзіміра Дубоўкі становіцца вядомым з 1921 года, калі газета «Савецкая Беларусь» надрукавала яго першы верш «Сонца Беларусі». А ўжо ў 1923 г. у Вільні выйшла яго першая паэтычная кніга «Строма». Зацікаўленымі, цёплымі водгукамі яе выхад сустрэлі старэйшыя пісьменнікі Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Антон Луцкевіч. Вершы гэтай кнігі выяўлялі шчырую любоў маладога паэта да Беларусі, жаданне служыць ёй паэтычным словам, нягледзячы на адарванасць ад радзімы. У вершы «Не трэба мне пяяць на Беларусі?» паэт знаходзіць вельмі прачулыя словы і вобразы, каб перадаць сваё пачуццё роднасці з бацькоўскім краем і любоў да яго:

> Матулі спеў, шматмілая старонка,
> Купалы край, край чараўніц-дзяўчат!
> Люблю цябе, бы татачку старога,
> Як дзеваньку люблю, як брата брат!

З гэтым адчуваннем любові і крэўнай прыхільнасці да ўсяго роднага У. Дубоўка пачаў свой шлях у літаратуру. Ён імкнуўся заглыбіцца ў гістарычнае мінулае беларускага краю ў пошуку гераічных постацяў і легендарных падзей. Ён любіў услухоўвацца ў рытмы кожнага новага дня — прадвесніка будучыні. У першым зборніку Дубоўка выявіў сябе як майстар вытанчанай вобразнасці, які ўмее бачыць красу ва ўсіх яе праявах — ад малюнкаў роднай прыроды да людскіх сэрцаў.

**Актывіст «Маладняка».** Пасля выхаду «Стромы» разгортваецца вельмі напружаная творчая і літаратурна-арганізацыйная праца Дубоўкі. Напачатку ён — адзін з актывістаў «Маладняка», узначальваў Маскоўскую філію, у складзе якой у 1924 годзе было 15 чалавек. Ён быў таксама адным з кіраўнікоў Цэнтральнага бюро «Маладняка» ў Мінску і часта выязджаў для арганізацыі новых філій у іншыя гарады Беларусі (напрыклад, у Магілёў). Неўзабаве ў Мінску выходзяць чарговыя кнігі яго паэзіі: «Там, дзе кіпарысы» (1925), «Трысцё» (1925), «Credo» (1926), пазней у Маскве — зборнік «Наля» (1927). У новых вершах паэта развіваюцца і ўзмацняюцца многія матывы і вобразы, што гучалі ў першым зборніку «Строма», а таксама з'яўляюцца новыя, напоўненыя прадчуваннем трывогі, ноты. Дубоўка ізноў натхнёна апявае красу прыроды і дзявочую красу, велічную таямніцу кахання, служэнне Бацькаўшчыне-Беларусі. У яго мастацкай палітры з'яўляюцца і экзатычныя фарбы, звязаныя з наведваннем Крыма ў 1924 годзе разам з групай пісьменнікаў. Яго замалёўкі прыроды змяшчаюць вобразы беларускага «трысця» і высока ўзнесеных у нябёсы паўднёвых «кіпарысаў» (новыя і нязвыклыя рэаліі для нашай паэзіі). Праз успрыманне чужога, экзатычнага ён спазнаваў яшчэ глыбей сваё, роднае.

**Слядамі Максіма Багдановіча.** Кіпарысы ўспрымаліся паэтам як ганаровая варта «свечак зялёных» на магіле Максіма Багдановіча ў Ялце, якую адшукалі беларускія паэты падчас гэтай вандроўкі: «Свечы зялёныя высока праменяць; // Людзі кажуць, што гэта кіпарысы...» («Нават мора змяніла свой колер»). Паэзія Максіма Багдановіча была для Дубоўкі ўзорам высокай гармоніі формы і зместу, сапраўднай красы мастацкага слова. Ужо ў першым зборніку У. Дубоўка выкарыстоўваў форму трыялета (нізка «Пацеркі»). Вандроўка ўзбагаціла яго новымі ўражаннямі і ўмацаваннем веры ў правільнасць абранага літаратурнага шляху. У Крыме, пры наведванні магілы Максіма Багдановіча, з'явілася ў Дубоўкі і прадчуванне новага літаратурнага «ўзвышша». Гэта ўзвышша творчасці, арыентаванай на нацыянальныя традыцыі (фальклорныя і літаратурныя) і найлепшыя ўзоры сусветнай літаратуры.

**Утварэнне «Узвышша».** Дваццатыя гады мінулага стагоддзя былі часам бурнай літаратурнай палемікі пра «стыль эпохі», эстэтычныя і ідэалагічныя прыярытэты ў творчасці. «Маладняк» перажыў у 1925 г. пік свайго ўзлёту, аднак ужо ўступіў у паласу крызісу. У маі 1926 г. на пасяджэнні Цэнтральнага бюро «Маладняка» разглядалася заява групы пісьменнікаў (Язэпа Пушчы, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Адама Бабарэкі) аб выхадзе са складу аб'яднання. Нязгоду таленавітых пісьменнікаў выклікала менавіта тое, што «Маладняк» з літаратурнай творчай арганізацыі ператварыўся ў асветніцкую. Пушча і Бабарэка ў сваіх выступленнях адзначылі занятпад мастацкасці ў «Маладняку», а таксама тое, што літаратура не можа развівацца праз каманды зверху, а толькі ў выніку павышэння культуры творчасці. Так адбыўся першы раскол «Маладняка»: названая група пісьменнікаў і Уладзімір Дубоўка выйшлі з яго складу і ўтварылі ў 1926 г. новае літаратурнае аб'яднанне «Узвышша». У самой назве яго выразна сімвалічна прачытвалася альтэрнатыва: свабоднае творчае «ўзвышша» мастакоў слова. З таго часу творчы лёс Дубоўкі быў непарыўна звязаны з «Узвышшам». Але з гэтага часу ў паэзіі Дубоўкі выразна выяўляюцца і трывожныя інтанацыі, элегічныя ноты: матывы смутку, неабходнасці мужнага служэння красе і праўдзе, супрацьстаяння злым, варожым сілам.

**Творчая сталасць.** Адстойваць сваё права на смутак і летуценні было вельмі нялёгка ў тагачаснай рэчаіснасці. Пацвярджэннем гэтаму можа быць і гісторыя з надрукаваннем вядомага верша Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына». У зборніку «Credo» ён быў змешчаны ў скарочаным і папраўленым выглядзе: радкі «Імкнешся да Камуны Свету, // Каб радасць красавала скрозь» былі заменены на «Цяпер Рэспубліка Саветаў // І радасць пунсавее скрозь», а апошні слупок з радкамі «Варожасць шляху не зачыніць, // У перашкодах дух расце...» быў зусім выкінуты, відавочна, таму, што ніяк не стасаваўся з папярэднімі радкамі пра квітненне радасці ў савецкай рэспубліцы. Толькі ў зборніку «Наля», які Дубоўка выдаў у 1927 г. у Маскве, ён аднавіў першапачатковы аўтарскі варыянт верша. Паэт вылучае дваістасць у вобразе шыпшыны з яе пялёсткамі і дзідамі. Гэты вобраз набывае значэнне мастацкага сімвала, з дапамогай якога ён глыбока і праўдзіва перадаў веліч і трагізм сваёй эпохі, выявіў прадчуванне ахвярнага лёсу паэта ў яго служэнні айчыне.

Вершы зборніка «Наля» сведчаць пра мастацкую сталасць таленту аўтара, вынашанасць і праніклівасць яго думак, уменне перадаваць тонкія душэўныя зрухі і памкненні. Тут пераважаюць элегічныя настроі. Зменлівасць розных эмацыянальных станаў паказвае нам лірычнага героя то ўзнёсла закаханым, то ў стане смутку і тугі.

Свае разважанні пра лёс краіны і служэнне паэта ў час вялікіх грамадскіх зрухаў і перамен Дубоўка працягваў у паэмах «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929), «Штурмуйце будучыні аванпосты!» (была даслана ім ва «Узвышша» ў 1929 годзе, але тады засталася ненадрукаванай з прычыны рэзка адмоўнай крытыкі папярэдніх паэм). Паэта папракалі ў адсутнасці разумення сучаснасці і шляхоў, якімі Беларусь крочыць у будучыню. Да таго ж над Дубоўкам, як і ў цэлым над «Узвышшам», навісла пагроза рэпрэсій і закрыцця за «адхіленне» ад «лініі партыі» ў галіне літаратуры, паводле якой пісьменнік павінен быў апяваць перамогу рэвалюцыі і дасягненні сацыялістычнага будаўніцтва.

**Шлях выгнання і пакуты.** Рэпрэсіі не прымусілі сябе доўга чакаць. Першай ахвярай расправы над літаратурай і пісьменнікамі, над свабодай думкі і творчасці стала аб'яднанне «Узвышша» і яго самыя актыўныя сябры: Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Уладзімір Жылка. Яны былі арыштаваны ўлетку 1930 года, абвешчаны «ворагамі народа» і абвінавачаны як удзельнікі «нацдэмаўскай» арганізацыі — так званага «Саюза вызвалення Беларусі». Арыштаваных (больш за сто

беларускіх інтэлігентаў) трымалі каля года ў турэмным зняволенні, дапытвалі і катавалі. Але сталінскаму рэпрэсіўнаму апарату так і не ўдалося даказаць існаванне такой арганізацыі, як «Саюз вызвалення Беларусі». Справа была закрыта, але амаль усе вязні былі пакараны пяцігадовай ссылкай у аддаленыя ад Беларусі мясціны. Для Уладзіміра Дубоўкі пачаўся другі — пякельны — круг яго жыцця.

Дваццаць сем шматпакутных гадоў правёў У. Дубоўка ў выгнанні, у абсалютнай творчай ізаляцыі. Пасля ссылкі ў Яранску (сем гадоў замест пяці) Дубоўку ў 1937 г. прыгаварылі да дзесяці гадоў канцлагера. Ён здолеў вытрымаць і гэтае выпрабаванне. Ён выжыў і не зламаўся. Але тое было яшчэ не апошняе кола пакут па сталінскім пекле. Адбыўшы свой тэрмін у канцлагеры, Дубоўка разам з жонкай Марыяй Пятроўнай пасяліўся ў Грузіі (яму было забаронена вяртацца ў Маскву або ў Беларусь). Аднак неўзабаве ў 1948 г. ён мусіў пакінуць і Грузію, бо як чалавека «заплямленага» перад уладай яго чакала так званае «вечнае пасяленне» ў Краснаярскім краі.

**Вяртанне з нябыту.** Пасля рэабілітацыі ў 1958 г. Уладзімір Дубоўка зноў пасяліўся ў Маскве. Ён часта прыязджаў на радзіму, у Беларусь. Займаўся тут выданнем сваіх кніг, дзе былі папраўлены многія вершы 20-х гадоў. Ён пісаў новыя творы, шмат перакладаў, напісаў казкі і аповесці для дзяцей. Значнымі творчымі дасягненнямі сталі для яго ў той час пераклады санетаў Шэкспіра і паэм «Бронзавы век», «Каін», «Шыльёнскі вязень» Байрана. Сам выбар тэкстаў для перакладу быў сімвалічным і многае тлумачыў у стаўленні пісьменніка да тагачаснага жыцця.

Няпростымі былі для паэта адаптацыя ў новым жыцці, вяртанне да любімай літаратурнай справы пасля вымушанага перапынку. Гэта быў трэці круг яго лёсу, напоўнены мудрай цярплівасцю. Калі ён, сівабароды волат, ізноў з'явіўся на літаратурным небасхіле, пачаў друкавацца, прымаць удзел у жывых літаратурных дыскусіях, удзельнічаць у сяброўскіх вечарынах і імпрэзах, ён працягваў заставацца загадкавым чалавекам-легендай. Дубоўка здзіўляў сучаснікаў. Здзіўляў маладым бляскам вачэй, які кантраставаў з доўгай сівой барадою. Здзіўляў у паводзінах, якія многія ўспрымалі за палахлівасць, адзначаючы, што ён быў занадта асцярожным у выказваннях; на пісьменніцкіх вечарынах неадменна падымаў тост «за кампартыю», асцерагаўся браць у бібліятэцы кнігі палітычнай тэматыкі, перарабляў на «патрэбу дня» ранейшыя свае вершы. Думаецца, што сучаснікі Дубоўкі не адчулі нечага патаемнага ў самім паэце, не зразумелі той ролі, якую ён сам для сябе абраў на сцэне рэгламентаваных грамадскіх адносін. Галоўным у гэтай ролі была глыбока схаваная іронія — адзінае, чым «зламаны» паэт мог «аддзячыць» «роднай савецкай уладзе». Толькі як пастаянную іронію, прычым схаваную, можна вытлумачыць Дубоўкавы «хваласпевы» партыі. Менавіта залішняя падкрэсленасць, з якой ён гэта рабіў, як згадваюць яго мемуарысты, настройвае на думку, што гэта была зручная і бяспечная маска. Дубоўка выдатна разумеў, у якое грамадства ён вярнуўся пасля рэпрэсій — гэта не было грамадства абсалютна вольных людзей, якое магло асудзіць уладу, што знішчыла столькі бязвінных людзей. Паэт мог дазволіць сабе быць асцярожным, ведаючы, якой цаной можа быць аплачана нават бяскрыўднае слова. У гэтым была мудрасць і цярплівасць паэта, які ведаў праўду жыцця, і яго ўчынкі адпавядалі гэтай праўдзе.

Кнігу сваіх успамінаў У. Дубоўка назваў «Пялёсткі» (1973), нібыта вяртаючыся да ўлюбёных вобразаў сваёй маладосці, да кветкі-шыпшыны, у вобразе якой ён яшчэ ў 20-я гг. апаэтызаваў родную Беларусь. І яшчэ адзін вобраз быў мілы паэту — гэта вобраз узвышша. Перш чым гэтае сімвалічнае слова стала назвай літаратурнага згуртавання, яно сустракалася ў многіх яго ранніх вершах. Дубоўка нязменна адчуваў сябе на ўзвышшы — на ўзвышшы жыцця і літаратуры. Гэтае пачэснае месца было наканавана яму і прыроджанай сілай яркага таленту, і здольнасцю прымаць на сябе найбольшую адказнасць. Бо той, хто на ўзвышшы, — бачыць далей за іншых, і ён вызначае шлях.

## Лірыка Уладзіміра Дубоўкі

**«Залатая асенняя раніца».** Верш датуецца 1922 годам, але ўпершыню быў надрукаваны ў 1960 годзе.

Твор прысвечаны хараству восеньскай раніцы, якая хвалюе паэта глыбінёй і нечаканасцю асацыяцый, шырокай гамай настрояў: ад светлай радасці да разважлівага смутку. Матыў радасці звязаны са святочным і ўрачыстым залатымззяннем восеньскай лістоты, якая стварае ўяўленне царскай раскошы, што пануе ў прыродзе, і перадаецца праз узнёслы настрой лірычнаму герою. Паўсюль зіхаціць золата, асляпляе незвычайны бляск. Здаецца, прырода трыумфуе ў сваім апошнім перадзімовым танцы залатых лістоў-матылькоў. Гэтыя «распаветраныя» лісты — адначасова краса і смутак развітання восеньскай прыроды. Развітальны

матыў кантрастуе з матывам залатога бляску. Паэт прызнаецца: «Развітальная хваля найгоршая, // Яна можа і сэрца спаліць». Аднак у трох заключных страфах верша развітальнатужлівы матыў змяняецца на аптымістычны матыў вяртання. Лірычны герой верша нібыта бачыць за часінай смутку, за цяжарам развітання з красой, за багнаю цемры — агеньчыкі будучага адраджэння характва. Ён бачыць, як «з-за балота мігціць, за выгарамі // прамяніцца пярэстая гаць». Настрой у канцы верша дасягае ўрачыста-ўзнёслай ноты, дзе пануюць хараство, пекната, а водбліскі позняга сонца афарбоўваюць нябёсы «кармазынам» (малінавым колерам). «Я прыйду, я вярнуся ізноў», — гаворыць лірычны герой ці то сваёй каханай, з якой развітаўся, ці то радзіме, з якой прадчувае расстанне, ці то восеньскай раніцы, якая знікае на вачах, уразіўшы ўяўленне паэта цудам свайго незямнога хараства. У вершы гучыць не толькі матыў развітання-вяртання, але і філасофская развага аб тым, што непазбежны скон лістоты не азначае такой жа непазбежнай наканаванасці для чалавечага лёсу: «Лёс для ўсіх не бывае аднакавы, // Як для тых засмучоных лістоў».

Верш характарызуецца багаццем метафарычных вобразаў, шчодра рассыпаных па ўсім тэксце: гэта і вобраз сонца, якое шчодра купаецца ў пушчы; гэта і мітуслівыя матылькі-мітульга лісцяў; гэта і дзень, які прыгаршчамі рассыпае лісты; гэта і пярэстая гаць, што мігціць-прамяніцца; гэта і небакрай, які «кармазынам гарыць». Ёсць у вершы словынаватворы, якія таксама заключаюць у сабе вобраз і з'яўляюцца метафарамі: напрыклад, калі аўтар гаворыць пра «дзвіну матылькоўмітульгі», ён стварае новую дзеяслоўную форму «распаветрыцца на берагі» і аўтарскі эпітэт «берагі беражыстыя». Тут праяўляецца дар Дубоўкі як паэта-эксперыментатара, які смела і па-новаму выкарыстоўвае моўныя сродкі. Ідэйна-эстэтычныя і стылёвыя асаблівасці гэтага лірычнага верша дазваляюць аднесці яго да імпрэсіяністычных твораў, дзе сузіранне прыроды спалучаецца з філасофскай роздумнасцю.

**«О, Беларусь, мая шыпшына».** Верш быў напісаны ў 1925 годзе. У тым жа годзе ў скажоным выглядзе быў змешчаны ў часопісе «Маладыя араты» і зборніку «Credo». У зборніку «Наля» (1927) надрукаваны ў першапачатковай аўтарскай версіі.

Гэты лірычны верш прасякнуты патрыятычным матывам любові да Беларусі. Лёс роднага краю ў часе гістарычных перамен і лёс паэта, адданага радзіме, — вось дзве ўзаемазвязаныя тэмы верша. Паэтычная задума верша і яго ідэйны змест увасобіліся ў сімвалічным вобразе шыпшыны. Яе пялёсткі і дзіды ўтвараюць кантрастную вобразную пару і сімвалізуюць любоў (служэнне) і выпрабаванне (ахвяру). Паэт выказаў сутнасць уласнага служэння Бацькаўшчыне ў наступных радках: «Пялёсткамі тваімі стану, // на дзіды сэрца накалю». Гэта адначасова і прароцкае прадбачанне: менавіта такім самаадданым у любові, самаахвярным было служэнне самога паэта Беларусі і такой была яго ахвяра ў імя яе. Дубоўка ў гэтым вершы выказаў прарочую думку пра лёс усяго свайго пакалення. Ён быццам прадчуваў трагедыю. Аднак будучыню Беларусі паэт бачыў шчаслівай, велічнай у красе шчырага будаўніцтва новага жыцця пад знакам «Камуны Свету». Камуна Свету азначае для яго агульначалавечае яднанне на грунце высокіх ідэалаў любові і дабра дзеля «красавання радасці». Тут няма пустой рэвалюцыйнай рыторыкі. Гучыць шчырае і натхнёнае жаданне паэта бачыць родны край годным і самабытным у супольнасці народаў, бачыць яго вольным і загартаваным у змаганні з перашкодамі. У вершы выказана глыбока лірычнае прызнанне паэта ў любові да айчыны перад жорсткім аблiччам эпохі, якая дыхае прадвесцем новых выпрабаванняў. Пачуццё трывогі ў вершы змяняецца пачуццём радасці ад стваральнай сатворчасці паэта і эпохі. Нягледзячы на перашкоды і цяжкасці, паэт вітае новы вобраз Беларусі, паэтызуе «зялёны ліст, чырвоны цвет», верыць у яе квітненне і росквіт.

У вершы «О, Беларусь, мая шыпшына» ўвасабляецца патрыятычны ідэал паэта, раскрываецца сутнасць яго грамадзянскага служэння Радзіме. Гэты верш набыў шырокае прызнанне і лічыцца паэтычнай эмблемай свайго часу і творчасці Уладзіміра Дубоўкі. Паэт спавядаў ідэалы вечнага хараства, сумленнасці і праўды.

**«Пальцы жоўтых кляновых лістоў».** Верш датуецца 1925 годам. Упершыню змешчаны ў зборніку «Наля» (1927). У жанравай форме гэтага верша спалучаюцца рысы прыродаапісальнай і філасофскай лірыкі.

Улюбёная тэма ранняга Дубоўкі — краса восеньскага развітання прыроды, выражаная ў вобразе-матыве жаўталісця. Верш мае палемічны ідэйны сэнс. Тут прысутнічае традыцыйны для тагачаснай творчасці паэта вобраз летуценняў — свабоднай мары чалавека аб узвышаным і прыгожым, аб дасканаласці свету. Яна немагчымая ў рэальнасці, але магчымая ў

душы творцы: «Летуценні не змерклі ў галлі, // Летуценняў згасіць немагчыма». Ёсць у вершы кантрастны вобраз-матыў светлага і чорнага, які развіваецца і ўзмацняе матыў «летуцення». Кантрасты восені вабяць і здзіўляюць лірычнага героя. Ён спрабуе разгадаць таемную ўзаемасувязь рэчаў і з'яў: «Ці таму, што сумуюць журавы, // ненасытна свіргочуць жорны?» Але галоўная думка-развага чакае ў канцы. Гэта сумная выснова з псіхалогіі чалавечых стасункаў у гістарычна пагрозлівым часе. У ёй чуюцца водгукі непрымірымай тагачаснай крытычнай палемікі, калі пісьменнікам дыктавалася, што і як трэба пісаць: «Людзі любяць душу прасаваць, // калі гэта душа чужая». Дубоўка шукаў магчымасці вершаванымі сродкамі сказаць пра балючае «прасаванне душы». Гэта была яго своеасаблівая форма пратэсту супраць рэгламентацыі літаратурных нормаў і густаў. Прадчуваючы ўвесь трагізм змагання з нарматыўнымі ўстаноўкамі, ён ніколі не лічыў свой шлях летуценніка-праўдашукальніка безнадзейным.

Багатая вобразна-метафарычная палітра гэтага верша, які можна лічыць яркім узорам імпрэсіяністычнай лірыкі. Ён перадае ўзрушанасць уражання, стварае рухомы пейзажны малюнак, звязаны з псіхалагічным станам чалавека. Дубоўка паўстае тут майстрам метафар, якія ствараюць надзвычай каларытны паэтычны пейзаж. І гэта не гульня вобразамі, хоць іх выяўленчай непаўторнасці мог бы пазайздросціць кожны таленавіты мастак, і нават паэт-імажыніст. Першая палова верша — гэта цэлы каскад «восеньскіх» метафар. «Пальцы жоўтых кляновых лістоў // мкнуцца восень схапіць за шыю», — з гэтай метафары пачынаецца верш. У ёй гучыць трагічная наканаванасць пагібелі, прычым не толькі ў сферы прыродных з'яў. Але нішто не можа парушыць велічнага хараства, нерукатворнай дасканаласці прыроды, сугучнай чалавечай душы, якую «прасуюць» тыя, каму яна чужая. Дасканалы восеньскі пейзаж дапаўняюць клён, «які ў вокны забразгатаў», а таксама «блакітная воўна» неба, на якім раскіданы зоркі-арэхі: «Месяц рваў арэхі з куста, // раскідаў над сусветам арэхі». Менавіта гэтае зорнае неба нараджае паэтавы летуценні, выклікае рэфлексію аб вечным і прыгожым, узносіць у высокія сферы дух. Але гармонію і супакой парушае трывога: далёка галосіць сава. Нечаканы знешні дысананс перакульвае ўсё: «Небакрай апракінуўся жалем». Але гэта не выпадковы вобраз: ён — як вынік таго «прасавання душы», якое так востра адчуваў паэт у сваім часе.

**«Родная мова, цудоўная мова!..»** Верш датуецца 1966 годам. У ім паэт вельмі эмацыянальна перадае пачуццё замілаванасці і любові да роднай мовы, якая праз усё яго жыццё была вытокам і асновай думак. Гэты верш мае грамадзянскае гучанне і вызначаецца патрыятычным пафасам. Родная мова, паводле паэта, — той найвышэйшы і найпрыгажэйшы дар, які толькі можа мець кожны народ і чалавек ад калыскі. Беларуская мова называецца ў вершы «яскравай нізкай самацветаў», кожны з якіх мае дзівосныя барвы, зіхаціць вечным агнём. І гэта не проста прыгожыя вобразы. Для Дубоўкі-паэта кожнае слова мае свой непаўторны каларыт і водар, ён чуе ў гуках роднай мовы бруенне крыніц і раскаты навальніцы, шум зялёнага бору і рытмы працоўных будняў. Усё, чым жыў і жыве чалавек у родным краі, адбілася, знайшло адухоўленае выяўленне ў яго мове. Кожнае слова адшліфавана вякамі, сцвярджае Дубоўка. Сам паэт быў глыбокім знаўцам мовы, дбаў пра яе чысціню і багацце. Мова — жывы непаўторны арганізм, які хоць і змяняецца, але застаецца нязменнай і вечнай каштоўнасцю народа. Аб гэтым паэт гаворыць у сваім вершы, услаўляючы родную мову як найвялікшы духоўны скарб, як вечнае «народнае сэрца».

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце тры перыяды-кругі творчага лёсу У. Дубоўкі і ахарактарызуйце кожны з іх.
2. Як вы разумееце вобраз узвышша ў жыцці і творчасці паэта?
3. Пералічыце зборнікі вершаў У. Дубоўкі 20-х гадоў. Якія галоўныя матывы і вобразы яго лірыкі?
4. Выпішыце вобразы-метафары з верша «Залатая асенняя раніца», пры дапамозе якіх аўтар раскрывае хараство прыроды.
5. У чым праяўляецца эксперымент У. Дубоўкі са словам?
6. Што сімвалізуюць вобразы шыпшыны, пялёсткаў і дзідаў у вершы «О, Беларусь, мая шыпшына»?
7. Якой паэту бачыцца будучыня Беларусі ў гэтым вершы?
8. Якія матывы ствараюць паэтычны кантраст у вершы «Пальцы жоўтых кляновых лістоў»?
9. Чаму родная мова з'яўляецца для У. Дубоўкі неацэнным духоўным скарбам народа?